Поскольку в Англии преданны традициям, то после получения валентинки на одежду прикрепляется какой-нибудь знак с именем возлюбленного. Кроме своих возлюбленных англичане поздравляют и своих любимых животных (лошадей, собак, кошек).

В Германии в День святого Валентина немцы украшают психиатрические больницы красными лентами, а в часовнях проводят богослужение, поскольку святой Валентин для немцев — это покровитель не влюбленных, а психически и нервнобольных.

В Польше уверены, что в Познаньской метрополии покоятся мощи святого Валентина, а над престолом находится его чудотворная икона, паломничество к которой 14 февраля помогает в любовных делах.

В США 14 февраля дарят друг другу карамельные красно-белые (цвета страсти и чистоты) сердечки, упакованные в коробки в форме сердца, а также сердца из марципана, конфеты, шоколад и, конечно же, цветы. В этот день в Америке покупают около 24 тысяч роз в минуту! По традиции с Днем всех влюбленных поздравляют всех тех, кого просто любят [4].

В заключение хотим отметить, что традиции праздника постепенно размываются, как размываются такие фундаментальные понятия, как семья, верность, любовь, вера. Кроме того, этот праздник указывает одиноким людям, насколько плохо быть без пары.

Общество навязывает нам стереотипы о том, что для того, чтобы быть успешным и счастливым, человеку обязательно нужна вторая половинка.

**Список цитируемых источников**

1. День святого Валентина. История праздника [Электронный ресурс]. — Режим доступа: http://pozdravok.ru /pozdravleniya/prazdniki/den-svyatogo-valentina/istoriya/ . — Дата доступа: 12.02.2019.

2. День святого Валентина [Электронный ресурс]. — Режим доступа: https://sputnik-georgia.ru/spravka/20170213/234865520/Den-Svjatogo-Valentina-14-fevralja-sut-istorija-i-obychai-prazdnika.html . — Дата доступа: 12.02.2019.

3. День святого Валентина. История праздника [Электронный ресурс]. — Режим доступа: https://riafan.ru/500749-den-svyatogo-valentina-istoriya-otnoshenie-rpc-kak-prazdnuyut . — Дата доступа: 12.02.2019.

4. Как отмечают День святого Валентина в разных странах [Электронный ресурс]. — Режим доступа: https://tolkopozitiv.ru/zhizn/dobro/kak-otmechayut-den-svyatogo-valentina-v-raznyih-stranah-mira.html . — Дата доступа: 12.02.2019.

УДК 94(476)+271"19-20"

**П. Ю. Булаты**

Установа адукацыі «Інстытут менеджменту спорту і турызму», Мінск

## ТРАДЫЦЫЯ ПЕРАНЯСЕННЯ СВЯТЫХ ІКОН У ЛЯХАВІЦКІМ ПРЫХОДЗЕ: ДОСВЕД МІНУЛАГА

Традыцыя ўшанавання праваслаўнай царквой святых ікон сягае ў глыбокую даўніну і мае трывалыя багаслоўскія падмуркі. Спрадвеку паломнікі з розных куткоў зямлі выпраўляліся да найбольш шанаваных хрысціянскіх абразоў, каб пакланіцца ім і ўшанаваць памяць, пакуты, духоўны подзвіг таго ці іншага святога, звярнуцца да яго з малітоўным заклікам ці просьбаю. Ёсць і адваротная практыка: святы абраз выпраўляецца да вернікаў. Як правіла, падобныя працэсіі суправаджаюцца ўрачыстасцямі, у якіх прымае ўдзел духавенства, свецкая эліта, вернікі той мясцовасці, куды выпраўляецца працэсія са святым абразам. Падобнае дзейства накіраванае перш за ўсё на сцвярджэнне духоўных каштоўнасцей, умацаванне вернікаў. У наш час — час адраджэння хрысціянскіх традыцый пасля эпохі камуністычнага тэрору і ганенняў на Царкву падобная практыка крыжовых хадоў з шанаванымі абразамі вяртаецца ў жыццё праваслаўнай царквы. Але гэтая традыцыя адраджаецца нанова, фактычна з нуля. Пры гэтым назіраецца парыў з мінулым, пошук новых формаў без уліку досведу мінулых пакаленняў у гэтай справе.

Звернемся да сучаснага досведу перанясення святой іконы, які меў месца ў горадзе Ляхавічы на прыходзе Узвіжання Святога Крыжа. З 14 па 16 ліпеня 2017 г. ляхавіцкім брацтвам святога пакутніка Серафіма Жыровіцкага быў арганізаваны крыжовы ход «От новомучеников к истокам духовности Белорусского края», прымеркаваны да 116-й гадавіны з дня нараджэння прападобнага пакутніка Серафіма. Братчыкамі было арганізавана перанясенне іконы Божай Маці Жыровіцкай з манастыра ў Ляхавічы і іншыя прыходы. Спярша аўтакалона прыбыла ў Баранавічы, адтуль пасля малебну з акафістам перад іконай працэсія выправілася ў Ляхавічы. У горадзе, дзе вучыўся будучы архімандрыт Серафім, некалькі соцень вернікаў віталі ікону каля капліцы на рынкавай плошчы, дзе адбыліся малітоўныя ўрачыстасці. На наступны дзень працэсія выправілася на радзіму святога — вёску Вялікае Падлессе. Адтуль ікону зноў перавезлі ў Ляхавічы, пасля чаго адбыўся семінар «Святые Белой Руси: актуальные вопросы почитания и прославления», дзе былі агучаны вітальные словы саноўнікаў, прагледжаны відэафільм і заслуханы даклады рознай тэматыкі. Усё мерапрыемства суправаджалася працай палявой кухні. Увечары другога дня працэсія выправілася ў вайсковую частку, дзе адбыўся малебен

© Булаты П. Ю., 2019

з іконай. Вярнулася ікона ў манастыр на трэці дзень, завітаўшы па дарозе ў прыход св. прарока Іллі ў вёсцы Адахаўшчына. Падчас руху аўтакалоны праз населеныя пункты гучнагаварыцель агучваў запісы духоўных спеваў. Суправаджалі абраз на працягу ўсяго аўтапрабегу не менш за 15 транспартных сродкаў. А ўсяго ва ўрачыстасцях прынялі ўдзел больш за 70 аўтамабіляў з розных рэгіёнаў Беларусі. У кожным месцы прабывання абраза Маці Божай ляхавіцкі благачынны протаіерэй Георгій падчас пропаведзі знаёміў вернікаў з жыццём і пакутамі Серафіма, архімандрыта Жыровіцкага [1].

Як бачым з прыведзенага прыкладу, традыцыя правядзення ўрачыстых працэсій з выкарыстаннем ушанаванага цудадзейнага абраза адраджаецца і мае месца ў духоўным жыцці ляхавіцкага праваслаўнага прыходу.

Звернемся да досведу мінулых пакаленняў ляхавіцкіх вернікаў у арганізацыі і правядзенні ўрачыстасцей з нагоды перанясення святой іконы Божай Маці. Адбываліся яны 20—21 верасня 1908 г., калі ў Ляхавічы была прывезена ікона Божай Маці з Афона (рысунак 1). З той нагоды была выдадзена адмысловая брашура аўтарства ўдзельніка падзей святара П. Сушчынскага «Торжество перенесения иконы Афонской Божией Матери “Предвозвестительницы” в Ляховичскую церковь» [2], дзе падрабязна апісваюцца ўсе ўрачыстасці, а менавіта — урачысты брацкі крыжовы ход.

У брашуры, якая носіць досыць ангажыраваны і палітызаваны характар, адзначаецца, што галоўная мэта перанясення іконы — умацаванне праваслаўнай веры ў неаднародным канфесійным асяроддзі. І ў гэтым рэчышчы Ляхавічы, як месца правядзення ўрачыстасцей, былі абраныя не выпадкова. У 1867 г. у Ляхавічах 2 500 прыхаджан тутэйшага касцёла разам з пробашчам іераманахам бенедыктынскага ордэна Анзельмам Гірдвойнам (потым — настаяцель царквы а. Антоній) далучыліся да праваслаўнай царквы. У той жа час адбылося пераасвячэнне Крыжа ўздвіжанскага касцёла (парафія заснавана ў 1602 г.; будынак узведзены ў 1780-я) у царкву праваслаўную. У справаздачы за 1879 г. адзначаецца, што ступень рэлігійнасці не здавальняючая і яшчэ пануюць «нравственно-религиозные наросты латинского происхождения». Маральна-бытавы стан прыхаджан таксама выклікаў заклапочанасць, бо «замечается много суеверий, обрядов и обычаев». На землях прыходу жыло шмат шляхты і былых аднадворцаў «рьяных папистов», якія ў розных галінах жыцця аказваюць негатыўны ўплыў на «воссоединённых прихожан» [3].

Праграма ўрачыстасцей была складзена і выканана Ляхавіцкім аддзелам Мінскага народнага брацтва пры асабістым удзеле старшыні аддзела А. Д. Пятрова, а таксама духавенства, прыхаджан. Да перанясення ў Ляхавічы ікона з Афона часова захоўвалася ў Мінску ў Крыжовай царкве Архірэйскага дома. Пасля распрацоўкі праграмы ікону было даручана перавезці ў Ляхавічы дэлегацыі ў складзе старшыні Мінскага народнага брацтва С. А. Някрасава, святара Ізяслаўскай царквы П. Сушчынскага і В. А. Каткоўскага.



Рысунак 1 — Ікона Афонскай Божай Маці,
якая была перанесена ў Ляхавіцкую царкву ў 1908 г.

20 верасня цягнік з іконай рушыў з Мінска і прыбыў на станцыю «Баранавічы» а 15-й гадзіне. Тым жа цягнікам на ўрачыстасці ехаў хор вучняў Ізяслаўскай царкоўнай школы. Для сустрэчы іконы вакзал у Баранавічах быў упрыгожаны сцягамі і кветкамі, каля яго сабраліся вернікі з Баранавіцкага, Калпеніцкага, Сталовіцкага, Гарадзішчанскага, Востраўскага прыходаў, якія прыйшлі на месца сустрэчы святыні хроснымі хадамі. Таксама прысутнічалі дэлегаты Ляхавіцкага аддзела народнага брацтва, земскі старшыня барон Бер і святары Ляхавіцкай і Сваятыцкай цэркваў, генералітэт кватэраваных у Баранавічах батальёнаў. Адзначана, што для сустрэчы іконы Божай Маці агулам сабраліся тысячы багамольцаў з самых аддаленых куткоў Наваградскага і Слуцкага ўездаў.

Адбыўся малебен, які суправаджаўся духоўнымі спевамі трох хораў. Затым вялікая працэсія рушыла па вуліцах Баранавіч да новай прыходскай царквы, якая ўзводзілася ў горадзе. Там была здзейснена вячэрня, пасля якой працэсія рушыла ў напрамку станцыі «Баранавічы» Палескай чыгункі, дзе па просьбе чыгуначнікаў быў зроблены прыпынак для супольнай малітвы. Ад станцыі хросны ход з іконай выправіўся ў в. Дарава, дзе быў запланаваны начлег. Насустрач працэсіі выйшаў крыжовы ход вернікаў з Адахаўшчыны, зліўшыся з якім, працэсія а 12-й гадзіне ночы дайшла да Дарава, дзе служылася ўсяночная.

На наступны дзень, 21 верасня, а 8-й гадзіне раніцы пасля чытання акафісту Божай Маці працэсія колькасцю 2—3 тысячы вернікаў рушыла ў Ляхавічы. Па дарозе да шэсця далучыліся вернікі з Падлескай і Голдавіцкай цэркваў, пасля чаго да іх прымкнуў ваенны аркестр з Баранавіч і Ізяслаўскі хор.

У Ляхавічы працэсія ўваходзіла праз дзве вытанчаныя аркі, упрыгожаныя кветкамі. Пад аркамі быў здзейснены кароткі малебен, пасля чаго ікону ўнеслі ў Ляхавіцкую царкву, упрыгожаную па-святочнаму. Святы абраз Божай Маці ўстанавілі ў адмысловы залачоны, мастацкай працы кіот. Пачалася божая літургія, у здзяйсненні якой прымалі ўдзел святары з Клецкай, Ляхавіцкай, Сваятыцкай, Адахавіцкай, Лукскай, Дараўскай, Востраўскай, Калпеніцкай, Падлескай, Голдавіцкай і Райчынскай цэркваў пры двух дыяканах. Урачыстасці цягнуліся да позняга вечара.

Як вынікае з апісання, урачыстасці 1908 г. мелі вялікі размах і маштаб. Досвед мінулых пакаленняў пры адраджэнні традыцыі арганізацыі крыжовых хадоў са святымі іконамі можа быць карысны для сучаснікаў.

**Спіс цытаваных крыніц**

1. Состоялся духовно-просветительский автомотопробег «От новомучеников к истокам духовности Белорусского края» [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: http://hramik.cerkov.ru/2017-07-28/10012/ . — Дата доступу: 12.11.2018.
2. *Сущинский, П.* Торжество перенесения иконы Афонской Божией Матери «Предвозвестительница» в Ляховичскую церковь, 20—21 сентября 1908 г. / П. Сущинский. — Минск : Тип. С. А. Некрасова, 1909. — 11 с.
3. Описание церквей и приходов Минской епархии 1878/79 гг. — Минск : Типолитография Б. И. Соломонова, 1879.

УДК 101.1:316.33

**С. И. Волков**
Учреждение образования «Белорусский государственный экономический университет», Минск

## ФИЛОСОФСКИЕ ПРОБЛЕМЫ И СВОБОДА ВЫБОРА В ОБЩЕСТВЕ ПОТРЕБЛЕНИЯ

Современное общество столкнулось с серьезной проблемой, которая называется «общество комфорта». Общество потребления имеет над социумом безграничную власть. Оно формирует не только естественные потребности в комфорте и образе жизни, но и «неестественные», которые делают человека заложником своих желаний и характеризуются безнравственностью, пренебрегают духовной составляющей сущности человека. Понятие «свобода» в данной проблеме имеет две стороны. Во-первых, человек свободен в своем выборе. Он сам решает, какой товар ему купить и как им воспользоваться. Но следует задать вопрос: «А так нужен ли был тот товар, который человек бездумно купил?». В этом плане человек не имеет свободы выбора. Человек не может справиться с манипуляцией, которая производится с ним.

Ж. Бодрийяр считает, что в современном обществе люди окружены не столько людьми, сколько вещами. Индивиды современного общества больше не заняты общением друг с другом, а увлечены стремлением завладеть, изучить эти материальные блага, которые постоянно видят в рекламе, заполоняющей их сознание в таких масштабах, что эти блага видятся им даже во сне. Каждый индивид живет не в окружении себе подобных, а в обществе этих бестелесных, безмолвных форм, взирающих на него со всех углов, шепчущих о могуществе, безграничных возможностях и сверхъестественной силе, а также об отсутствии друг для друга. Люди становятся функциональными благодаря этому симбиозу с вещами [1, с. 4].

Перед тем как говорить о проблемах современного общества, нам бы хотелось обратиться к одному из законов общественного развития: «бытие определяет сознание», который был предложен Карлом Марксом. Первое качество человека — социальное, поэтому индивид не может быть отделен от общества и быть полностью автономным. Общественное сознание влияет на жизнь каждого члена социума. Человек является зависимым от среды, в которой он живет. Он подчиняется тем факторам, которые ему диктует окружающая действительность. В целом все материальные аспекты, которые окружают человека, формируют его бытие. Сознание

© Волков С. И., 2019